И. С. Федченко

# МАЦНЕЙШАЯ КРЭПАСЦЬ БЕЛАРУСІ

У другой палове XVI ст. Жыгімонт Аўгуст падарыў Быхаў Яну Каралю Хадкевічу. Да 1590 г. на месцы мураванага замка існавалі драўляна-земляныя ўмацаванні. У 1590 г. уладальнік Быхава гетман вялікі Ян Караль Хадкевіч атрымаў ад караля і вялікага князя Жыгімонта Вазы грамату на ўзвядзенне новых мураваных замкавых умацаванняў. Будаўніцтва вялося ў 1610 – 1619 гг. і завяршылася ўжо Львом Сапегам. Быхаў перайшоў да Сапег дзякуючы шлюбу Ганны, дачкі Яна Караля Хадкевіча, з сынам Льва Сапегі Янам Станіславам у 1621 г. Быхаўскі замак займаў участак берага ў выглядзе няправільнага прамавугольніка памерам 77?100 м, з поўдня, захада і поўначы быў умацаваны глыбокімі і шырокімі (да 22 – 27 м) равамі, а па краях пляцоўкі – земляным валам з бастыёнамі. Па перыметры дзядзінца размяшчаліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы, у т. л. комплекс мураванага палацава-замкавага ансамбля. "Прыступны" заходні бок абароны замка з уязной брамай быў дадаткова ўмацаваны 8-траннымі 2-ярусным цаглянымі вежамі, якія мелі па 7 – 8 байніц і фланкіравалі подступы да брамы. Брама была таксама мураваная, 2-ярусная са скляпеністым перакрыццем, з купалам – "галкай" і ветранікам з гербам Сапегаў. Двухстворкавыя палотнішчы варот былі дадаткова ўмацаваны кратай – герсай і спецыяльнай сістэмай жалезных запораў. Да брамы вёў драўляны мост, пасярэдзіне якога стаялі дадатковыя "краты з дрэва сталярскай работы". Таксама ў крэпасці працавала людвісарня. Зброя і металічныя даспехі, выробленыя быхаўскімі замкавымі збройнікамі, карысталіся вялікім попытам у Беларусі і за яе межамі. Замак перажыў шмат аблог і штурмаў. У 1648 г. атрад украінскіх казакоў на чале з Ф. Гаркушам не здолеў яго ўзяць. Таксама аблогі Быхава былі падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 - 1655, 1659, 1660 - 1661 гг) і Паўночнай вайны (1702 і 1707 гг.). Падчас Паўночнай вайны замак быў моцна пашкоджаны. Гэта было звязана са становішчам Сапегаў у палітычнай іерархіі беларускіх зямель у канцы XVII – пачатку XVIII ст. Кароль Ян Сабескі, каб супрацьдзейнічаць роду Пацаў, даваў вышэйшыя дзяржаўныя пасады Сапегам, якія ў сваю чаргу не грэбавалі злоўжываннямі. Казімір Ян Сапега ў 1680-я гг. дасягнуў дамінавання ў ВКЛ. У 1696 г. супраць Сапегаў пачалася адкрытая барацьба большай часткі шляхты ВКЛ на чале з віцебскім кашталянам Коцелам. Пасля абрання саксонскага курфюрста Аўгуста Моцнага каралём Рэчы Паспалітай К. Я. Сапега павёў курс на аддзяленне ВКЛ ад Польшчы з мэтай захапіць велікакняжацкую ўладу. У 1700 г. імператар Леапольд І, каб узмацніць свой уплыў у Рэчы Паспалітай, надаў прадстаўнікам чарэйска-ружанскай лініі роду Сапегаў тытул князёў Свяшчэннай Рымскай імперыі. Сапега быў блізкі да сваёй мэты і толькі ўзброеная кааліцыя Караля Станіслава Радзівіла, князёў Агінскіх, Вішнявецкіх і іншых магнатаў, пачаўшы супраць Сапегаў сапраўдную грамадзянскую вайну, здолела перамагчы іх у бітве пад Алькенікамі ў 1700 г. Пасля гэтага Сапегі перайшлі на бок шведскага краля Карла XII падчас Паўночнай вайны (1700 - 1721 гг.) і падтрымалі Станіслава Ляшчынскага – шведскага вылучэнца на сталец Рэчы Паспалітай. Шляхта працягвала ваяваць супраць Сапегаў і заключыла з рускім царом Пятром І дагавор аб расійскай ваеннай і грашовай дапамозе. У сувязі з супрацьстаяннем перыяду Паўночнай вайны замак быў значна пашкоджаны. Праз некаторы час замак быў адноўлены. Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі мяжа была перанесена далёка на Захад і Быхаў згубіў сваё стратэгічнае значэнне прыгранічнага горада. А пасля паўстання 1830 - 1831 гг. замак быў канфіскаваны ў Сапегаў і перайшоў у дзяржаўную казну. Пасля гэтых падзей замак доўгія гады знаходзіўся ў запусценні, але ўжо ў 1870-я гг. яго адрамантавалі і размясцілі тут казармы. У XX ст. падчас тых ці іншых работ па ўдасканаленні горада замак паступова разбураўся: былі разабраны ўязныя брамы, пры будаўніцтве насыпу для моста быў цалкам знішчаны паўднёвы бастыён, а паўднёвы бастыён зрылі бульдозерам падчас пракладкі сучаснай вуліцы Леніна. У ацалелых будынках замка ў гады Вялікай Айчыннай вайны развяшчаўся нямецкі штаб, тут жа катавалі і забівалі яўрэяў. У 1990-я гг. у ацалелых будынках размяшчаўся цэх па дрэваапрацоўцы, але пасля пажару ў жніўні 2004 г. замак зноў апынуўся закінутым. На дадзены момант абвешчана пра пачатак рэстаўрацыі замка. У 2013 г. для аднаўлення вежаў, добраўпарадкавання тэрыторыі і кансервацыі фрагментаў замка дзяржавай выдаткавана каля 7 млрд беларускіх рублёў. Пачатак пакладзены і хутка мы ўбачым вынік плёну рэстаўратараў.


1. http://be-x-old.wikipedia.org/wiki/Быхаўскі замак.
2. http://be-x-old.wikipedia.org/wiki/Гісторыя Быхава.
3. http://be-x-old.wikipedia.org/wiki/Быхаў.


*Федченко Илья Сергеевич*, БГУИР, ФКП, ЭТТ, ?s95@mail.ru

*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, зав.кафедрой гуманитарных дисци- плин, к. и. н., доцент.

Библиотека БГУИР